**Айчынная гістарычная навука панесла вялікую страту. 13 чэрвеня 2017 г. на 64 годзе адыйшоў з жыцця вядомы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ**

# МІКАЛАЙ МІХАЙЛАВІЧ ЗАБАЎСКІ



Нарадзіўся М. М. Забаўскі 10 лістапада 1953 г. у г. Мар'іна-Горка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Пасля тэрміновай службы ў радах Савецкай Арміі ў 1973 г. атрымаў накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне, а праз год паступіў на гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. На працягу вучобы ў інстытуце з'яўляўся старастай акадэмічнай групы, кіраваў работай ДНД (добраахвотна-народнай дружыны), прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці інстытута і факультэта. У складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў працаваў на новабудоўлях у БССР, Комі АССР, Якуціі (БАМ).

У 1979 г. пасля заканчэння навучання на гістарычным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага па спецыяльнасці «гісторыя і замежная (англійская) мова» М. М. Забаўскі быў накіраваны на працу ў Мінскае педагагічнае вучылішча, дзе выкладаў айчынную гісторыю, этыку, эстэтыку і іншыя дысцыпліны.

У лістападзе 1984 г. Мікалай Міхайлавіч паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. Пад навуковым кіраўніцтвам доктара гістарычных навук М. В. Біча распрацоўваў складаную навуковую праблему ў беларускай гістарыяграфіі – «Удзел насельніцтва Беларусі ў выбарчых кампаніях і дзейнасць дэпутатаў ад края ў расійскай Дзяржаўнай думе (1906–1917 гг.)». У 1988 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

З 1987 па 1993 г. Мікалай Міхайлавіч працаваў на пасадзе навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі Беларусі перыяду капіталізму Інстытута гісторыі Акадэміі навук.

З 1993 г. – дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ. З 1995 па 1998 г. – дактарант БДПУ. У 2000 г. паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў сувязі з выбарамі і дзейнасцю расійскай Дзяржаўнай думы I–IV скліканняў (1906–1917 гг.)». З 2001 г. – прафесар кафедры гісторыі Беларусі.

З 2002 па 2004 г. М. М. Забаўскі з'яўляўся загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі культуры факультэта беларускай філалогіі і культуры. Адначасова выконваў абавязкі дырэктара Дзяржаўнай установы «Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны». З 2004 па 2014 г. – дэкан гістарычнага факультэта БДПУ.

За час працы ў БДПУ М. М. Забаўскі праявіў сябе высокакваліфікаваным выкладчыкам і навуковым работнікам, вопытным арганізатарам вучэбна-выхаваўчага працэсу. Паспяхова займаўся навукова-даследчай і навукова-метадычнай работай. Ён грунтоўна даследаваў гісторыю палітычных партый і рухаў, грамадска-палітычную думку Беларусі, пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, культуру Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Мікалай Міхайлавіч Забаўскі – аўтар 3 манаграфій, 19 навукова-метадычных і 112 навуковых прац. Пад яго навуковым кіраўніцтвам падрыхтаваны і паспяхова абаронены 2 доктарскія і 3 кандыдацкія дысертацыі.

Больш за дзесяць гадоў М. М. Забаўскі з'яўляўся членам Саветаў па абароне дысертацый пры БДПУ і БДУ, меў вялікі вопыт экспертызы доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый і магістарскіх прац. Узначальваў Праблемны савет па гістарычных навуках у БДПУ, уваходзіў у склад 6 рэдакцыйных калегій навуковых выданняў: «Беларускага гістарычнага часопіса», «Гісторыя і грамадазнаўства», «Весці БДПУ» і іншых выданняў.

Плённы ўклад унёс Мікалай Міхайлавіч у арганізацыю і правядзенне штогадовых рэспубліканскіх навукова-тэарэтычных канферэнцый на базе гістарычнага факультэта, якія былі прысвечаны эпахальным датам гісторыі Беларусі, прымаў актыўны ўдзел у іншых рэспубліканскіх навуковых мерапрыемствах.

З'яўляўся членам навукова-метадычнага савета па гуманітарнай адукацыі пры БДПУ.

За асабісты ўклад у развіццё айчыннай навукі і адукацыі Мікалай Міхайлавіч Забаўскі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі – медалём «За працоўныя заслугі» і юбілейным медалём «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі», граматамі і ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і БДПУ, быў занесены на Дошку гонара БДПУ.

М. М. Забаўскага вылучала мэтанакіраванасць, патрабавальнасць да сябе і падначаленых, адказнасць, дысцыплінаванасць, добразычлівасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленых задач. Мікалай Міхайлавіч Забаўскі застаецца ўзорам працавітасці, самаадданага служэння навуцы і людзям, сумленнасці і сціпласці, а таксама клапатлівасці і любові да сваёй сям'і, дзяцей і ўнукаў.

*Выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта БДПУ падзяляюць горыч вялікай страты і выказваюць глыбокія і шчырыя спачуванні сям'і: Ірыне Іванаўне Забаўскай, старшаму выкладчыку факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, дочкам Наталлі і Вераніке, якія абралі прафесійны бацькоўскі шлях, родным і блізкім Мікалая Міхайлавіча.*

Рэпазіторый БДПУ